ОРГАН парткома прафкома і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

27 ВЕРАСНЯ 1937 г. № 14 (44)

НА НІЗКІМ УЗРОЎНІ КРЫТЫКІ

На справаздачна-выбарчым сходзе ЛКСМБ

24 верасня пачаўся справаздачна-выбарчы комсамольскі сход БДУ. Сход праходзіць пасля гістарычных рашэнняў IV пленума ЦК ВЛКСМ, праходзіць тады, калі па усёй краіне вядзецца вялікая работа па ачышчэнню комсамольскіх арганізацый ад заклятых ворагаў народа і іх прыхвасняў.

Зараз па БССР заканчваецца справаздачна-выбарчая кампанія. Гэта абавязвала камітэт комсамола ўлічыць усе памылкі і недахопы, дапушчаныя радам арганізацый, гэта абавязвала як след падрыхтаваць сход, каб правесці яго на высокім палітычным узроўні.

Аднак, усяго гэтага камітэт комсамола не ўлічыў. Справаздачны даклад тав. Гурыновіча не быў дастаткова палітычна завостраны. Тав. Гурыновіч перапяваў вядомыя арганізацыі факты, да рэчы, не даваў ім належнай палітычнай ацэнкі. Між тым, становішча ў комсамольскай арганізацыі абавязвала камітэт зрабіць зусім іншую справаздачу.

Камітэт комсамола нават і пасля выкрыцця ворагаў народа ва універсітэце не зрабіў належных вывадаў, не мабілізаваў арганізацыю на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва. Да гэтага часу ў арганізацыі застаюцца людзі, не ўпушчаючыя ніякага палітычнага давер'я.

Вось, напрыклад, тав. Фабрыкант, які яшчэ да гэтага часу з'яўляецца чамусьці комсоргам курса. Фабрыкант разваліў работу курсавой комсамольскай арганізацыі, адарваўся ад комсамольскіх мас. Справа дайшла да абураючага становішча, што асобныя комсамольцы не ведаюць свайго комсорга.

Сам Фабрыкант таямнічымі шляхамі прабраўся ў СССР. У камітэце ведалі аб усім гэтым, але бясклопатнасць дайшла да таго, што справу аб ім не разбіралі і пакідалі яго ў кіраўніцтве комсамольскай арганізацыі курса.

Не гледзячы на зусім ясныя ўказанні таварыша Сталіна на лютаўска-сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) аб неабходнасці ўзмацніць большэвіцкую пільнасць, чаго патрабуе ад нас факт капіталістычнага акружэння, але комсамольскі камітэт не зрабіў і з гэтага неабходных вывадаў. Было многа размоў аб пільнасці і капіталістычным акружэнні, але сапраўднай большэвіцкай пільнасці ў камітэце комсамола не было.

Не можа задаволіць нас і становішча палітвучобы. Палітзаняткі праходзілі на нізкім палітычным узроўні. Асабліва ў школах прапагандыстаў Акімавай, Андрушчанкі і інш. Мала скарыстоўваліся на занятках першакрыніны. Кансультацыі і семінары не задавальнялі прапагандыстаў. Комсамольцамі-прапагандыстамі профсеці камітэт не кіраваў. Няўважлівы падбор прапагандыстаў прыводзіў да таго, што ў рады кіраўнікоў палітшкол пападала трацкісцкая свора (Верам'юк) і палітычна нявытрыманыя людзі (Хацінскі і інш.).

У комсамольскай арганізацыі, як і наогул ва ўніверсітэце культавалася адна з форм зажыму крытыкі — перэгавання на сігналы друку і выступленні комсамольцаў на сходах. Гэта прывяло і да нізкай актыўнасці на справаздачна-выбарчым сходзе.

Комсамольскі камітэт і адказны за абаронную работу тав. Кучар сваёй бяздзейнасцю садзейнічалі развалу ваенна-фізкультурнай работы. Ваенна-тэхнічныя экзамены ў БДУ зусім сарваны. Таксама нічога не робіцца па падрыхтоўцы варашылаўскіх стралкоў, плаперыстаў, парашутыстаў, пілотаў, значкістаў ППХА, ГПА і ГСА.

Было не мала сур'ёзных сігналаў аб бяздзейнасці Кучара і загадчыка ваеннай кафедры Спегальскага. Але камітэт далей размоў не ішоў. Гэтыя людзі і зараз «кіруюць» абароннай работай ва універсітэце.

Можна было чакаць, што даклад аб бяздзейнасці комсамольскага камітэта выкліча рэзкую крытыку з боку выступаючых у спрэчках комсамольцаў. Але на сходзе гэтага не атрымалася. Выступаючыя пашлі па шляху дакладчыка і зноў гаварылі аб тых-жа даўно вядомых фактах.

Новаму камітэту комсамола трэба будзе сур'ёзна ўлічыць становішча арганізацыі і ўрокі справаздачна-выбарчага схода ў сваёй практычнай рабоце.

АУЛАДАЦЬ БОЛЬШЭВІЗМАМ!

УЗОРНА ПАСТАВІЦЬ ПАРТВУЧОБУ

Наша партыя і таварыш Сталін надаюць велізарнае значэнне ідэалагічнаму росту комуністаў. Пленум ЦК ВКП(б) у сёй фашучасцю паставіў пытанне аб павышэнні палітычнага выхавання і аўладання большэвізмам. Ворагі народа усямерна імкнуліся зрыхаць палітычнае выхаванне комуністаў і працоўных мас. Яны даводзілі вывучэнне гісторыі партыі толькі дакастрычніцкага перыяда. Гэта свора не хацела, каб масы выхоўваліся і закаляліся на баявых старонках гісторыі ленінска-сталінскай партыі, на тым перыядзе партыі, калі быў разгромлен контрреволюцыйны трацкізм і бухарынскія рэстаўратары капіталізма.

Аднак не ўсе комуністы нашай арганізацыі ўсвядомілі важнасць палітычнага выхавання. Вось, на першыя заняткі гуртка па вывучэнню твораў класікаў марксізма (прапагандыст тав. Чымбург) з'явілася толькі 6 чалавек з агульнага ліку 16. У гуртку па вывучэнню гісторыі партыі (прапагандыст тав. Камінскі) з 17 чалавек па занятках прысутнічала ўсяго 9. Неабходна асоба ўказаць на тое, што комуністы Прановіч, Комлік, Магіленка, Суворaў, Еўсюкевіч, Міхалевіч, Тупіца прапусцілі першыя і другія заняткі.

Некаторыя комуністы (Рогаў, Каленік і др.) прыходзяць на партыйныя заняткі не падрыхтаванымі. Яны нічога не чытаюць з рэкамендацыйнай літаратуры.

Партыйны камітэт павінен зрабіць з гэтага належны вынік. Трэба прыцягнуць да адказнасці комуністаў, якія нядбайна адносяцца да партыйных занятак. У гэтым годзе партвучобу мы павінны паставіць узорна.

МІЛЬМАН.

ПОСПЕХІ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

Услед за універсітэцкай спартакіядай, якая паказала значныя поспехі, 24 верасня на стадыёне «Дынамо», нашы фізкультурнікі прымалі ўдзел у закрыцці лёгка-атлетычнага сезона. Універсітэт выставіў 4 каманды.

У малай шведскай эстафеце першай выступіла жаночая каманда ў складзе Шчэмелевай, Дзяшко, Бараноўскай, Севасцьянавай. Яны занялі 4 месца. Затым мужчынская каманда — Зязюля, Брыш, Апельбаум и Скорабагаты выйшлі пераможцамі ў вялікай швецкай эстафеце, заняўшы першае месца сярод вытворчых калектываў.

Жаночая каманда ў складзе Сцюль)авіч, Гольберг, Ерменка, Залатарэнка і Барысевіч у эстафеце 5 х 500 занялі першае месца. Яны атрымалі прыз закрыцця лёгка-атлетычнага сезона.

Апошнімі выступалі мужчыны (Крышчановіч, Тумас, Зіневіч, Лісаковіч і Малец) у эстафеце 5 х 1000, якія абагналі каманду педінстытута, але першае месца асталося за камандай «Спартак».

БРЫШ.

Пад агонь самакрытыкі работу профбюро

Не адзін раз студэнты крытыкавалі дрэнную работу профбюро хімфака, але справа не цалепшылася. Соцспаборніцтва па факультэце, носіць фармальны характар. Асабліва дрэнна пастаўлена культурна-масавая работа. Культработнік тав. Карасіна абмяжоўваецца толькі раздачай білетаў у кіно або ў тэатр.

Студэнты некалькі разоў патрабавалі ад профбюро і тав. Кукінай, каб арганізаваць навуковы дыспут, вечар самадзейнасці і т. д., але нічога гэтага за ўвесь справаздачны перыяд не было зроблена. Работай дабраахвотных грамадскіх арганізацый ніхто не кіруе і яны фактычна развалліся.

Неўзабаве пачнуцца перавыбары профбюро. Члены саюза павінны ўзяць пад агонь самакрытыкі работу профбюро і абраць у новы склад профбюро здольных і адданых справе таварышоў.

В-АЯ.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НАВУКОВЫМІ КАДРАМІ ГЕАФАК

Геаграфічны факультэт БДУ існуе ўжо чацверты год. У пачатку сваёй арганізацыі ён насіў гучную назву: геолага-глебазнаўча-геаграфічны факультэт. У 1937 г. па невядомай прычыне два адзяленні (геалагічнае і глебазнаўчае) былі ліквідаваны.

Пры рэарганізацыі факультэта студэнтам абяцалі вельмі многа, але на справе атрымоўваецца адваротнае. У гэтым годзе на факультэце няма ні аднаго навуковага работніка са званнем прафесара. Увесь выкладчыцкі склад састаіць з асістэнтаў і кандыдатаў у дацэнты.

Дэкан геафака тав. Андрушчанка нічога не робіць, каб забяспечыць факультэт адпаведнымі навукозымі кадрамі. І як вынік—важнейшая дысцыпліна гістарычная геалогія змазваецца, бо яе чытае зусім непадрыхтаваны выкладчык тав. Кавалёў. Сам. тав. Андрушчанка, не будучы спецыялістам па фізгеаграфіі капіталістычных краін, узяўся чытаць гэты адказнейшы курс. Рад другіх дысцыплін таксама чытаецца выключна дрэнна, а эканамічная геаграфія зусім не пачыналася чытацца. Акрамя гэтага бываюць частыя зрывы занятак.

Рэктарыят БДУ павінен прыняць тэрміновыя захады, каб забяспечыць геафак навуковымі кадрамі.

СТУДЭНТЫ.

ЗА РАБОТУ ПА-НОВАМУ

Профсаюзная арганізацыя БДУ праводзіць зараз перавыбары сваіх органаў. Перавыбары праходзяць ва ўмовах вялікага павароту ў палітычным жыцці нашай краіны, ва ўмовах узнятай палітычнай актыўнасці мас на аснове Сталінскай Канстытуцыі.

Ворагі народа заўсёды імкнуліся падарваць магутнасць нашай радзімы. Таварыш Сталін не раз папярэджваў партыю і рабочы клас аб павышэнні большэвіцкай пільнасці і аб канчатковым выкарчоўванні трацкісцка-бухарынскай своры, шпіёнаў і дыверсантаў.

Апошні пленум ВЦСПС у сваёй пастанове адзначыў, што профсаюзныя органы адарваліся ад профсаюзных мас, культурны ўзровень і палітычная актыўнасць якіх вельмі вырасла. Гэта поўнасцю адносіцца і да нашага прафкома і факультэцкіх профработнікаў. Большэвіцкая крытыка, якая была разгорнута па справаздачнаму дакладу старшыні прафкома тав. Камінскага, ускрыла дрэнныя метады работы прафкома.

Бюракратызм, адрыў ад студэнцкіх мас, парушэнне прынцыпаў профсаюзнай дэмакратыі і прытупленне класавай пільнасці, не давалі магчымасці прафкому праводзіць па-большэвіцку барацьбу з класавымі ворагамі, пракраўшымися ва ўніверсітэт.

«Некаторыя профработнікі лічаць, што барацьба са шкоднікамі, ворагамі рабочага класа — гэта не іх справа, а справа іншых органаў. Яны забылі аб тым, што партыя неаднаразова патрабавала ад профсаюзаў барацьбы з бюракратычнымі скажэннямі у совецкіх і гаспадарчых органах, а тым больш—барацьбы са шкоднікамі ў справе культурна-бытавога абслугоўвання» (IV пленум ВЦСПС).

Адной з велізарных задач соцыялістычнага будаўніцтва з'яўляецца барацьба з перажыткам капіталізма у эканоміцы і свядомасці мас.

Ці змагаўся наш прафком за выкананне гэтай задачы партыі? Не, нельга гэтага сказаць. Палітычна-выхаваўчая, масавая работа ў профарганізацыі настаўлена дрэнна. Налітагітацыя была сарвана ў мінулым годзе, не наладжана яна і зараз. Асабліва гэта злачынна цяпер, калі наша краіна рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР па Сталінскай Канстытуцыі і агітацыя набывае асаблівае значэнне.

Мастацкая самадзейнасць студэнтаў не заахвочвалася, не работалі харавы, драматычны і іншыя гурткі.

Прафком не кіраваў навукова-даследчымі гуркамі, якія лічыліся толькі на паперы.

Асабліва недапушчальна-бюракратычныя адносіны прафкома былі да соцспаборніцтва і ўдарництва. У выдатнікі часта вызначаліся студэнты, якія ў сапраўднасці не былі выдатнікамі.

У справе палітыка-выхаваўчай масавай работы сярод студэнтаў прафком і камітэт комсамола павінны былі працаваць у самым цесным кантакце. Але гэтага ў іх не было. Бюракратызм і зазнайства работнікаў прафкома і камітэта комсамола (у першую чаргу Камінскага, Гурыновіча і Рыбакова) перашкаджалі па-большэвіцку працаваць у адной упражцы па выхаванню студэнцкай моладзі універсітэта.

Разгарнуўшы большэвіцкую крытыку і самакрытыку, агульны сход прызнаў работу прафкома нездавальняючай. Гэта павінен улічыць новавыбарчы склад прафкома і паставіць работу профарганізацыі БДУ на узровень палітычных задач краіны, пастаўленых партыяй і таварышам Сталіным.